http://edoc.bseu.by

# ПРАЕКТ КОДЭКСУ ГРАМАДЗЯНСКАГА СУДАВОДСТВА Ў КАНТЭКСЦЭ ТЭНДЭНЦЫЙ РАЗВІЦЦЯ ЦЫВІЛІСТЫЧНАГА ПРАЦЭСУ

В. С. Якімёнак, О. В. Бадакова

У 2014 годзе, з моманту стварэння адзінай сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі, пачалася ўніфікацыя грамадзянскага і эканамічнага працэсуальнага заканадаўства, вынікам якой стала фармаванне праекта Кодэкса Грамадзянскага судаводства Рэспублікі Беларусь (далей – праект КГС), а ў сакавіку 2022 года Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь вынес яго на грамадскае абмеркаванне [1].

Гэты праект быў прызваны ліквідаваць існуючыя супярэчнасці ў працэсуальных кодэксах, а таксама забяспечыць адзінства нарматыўнага рэгулявання працэсу разгляду грамадзянскай справы па сутнасці, захаваўшы асаблівасці асобных працэсуальных працэдур з улікам спецыфікі праваадносін. Праблема застаецца актуальнай на сённяшні дзень, паколькі уніфікацыя грамадзянскага і гаспадарчага працэсуальнага заканадаўства аб’ектыўна неабходна, а збліжэнне дзвюх галін дасць магчымасць мінімізаваць рызыкі магчымых прабелаў, разыходжанняў, калізій у рэгуляванні працэдуры па грамадзянскіх і эканамічных справах.

Яшчэ да апублікавання праекта КГС тэарэтыкамі абмяркоўвалася пытанне, які з двух дзеючых кодэксаў – Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь (далей – ГПК) [2] або Гаспадарчы працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь [3] – ляжа ў яго аснову. Цяпер можна канстатаваць, што складальнікі ў роўнай ступені ўлічвалі асаблівасці двух кодэксаў. Так, Т. В. Сысуеў адзначае, што праект КГС запазычыў з ГПК наступнае:

1) больш выпрацаваную выразную ўнутраную структуру, асабліва структуру інстытутаў агульнай часткі;

2) больш удалае рэгуляванне неіскавых вытворчасцей;

3) дэталёвыя класічныя падыходы да рэгулявання пастадыйнага руху працэсу і г. д.

З Гаспадарчага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь у праект КГС запазычаны:

1) абмежаванне храналагічных рамак прадстаўлення доказаў і раскрыцця аргументаў;

2) шырокае кола патрабаванняў, па якіх дапушчальна прымяненне загаднага вядзення ў эканамічных судах;

3) дэталёвае рэгуляванне форм і спосабаў прымірэння, а таксама нормы, якія рэгулююць судовую прымірыцельную працэдуру;

4) трохзвенная сістэма праверкі судовых пастаноў;

5) больш удалыя і кампактныя тэрміны [4].

У сувязі з гэтым прапануем свой аналіз зместу праекта КГС:

1. У арт. 55 праекта КГС прадугледжана новая сістэма ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства: а) асобы, якія ўдзельнічаюць у справе; б) іншыя ўдзельнікі працэсу; в) прадстаўнікі [1].

2. У адпаведнасці з арт. 54 дзеючага ў цяперашні час ГПК прадстаўнікі вызначаюцца як юрыдычна зацікаўленыя ў зыходзе справы асобы, якія маюць дзяржаўную, грамадскую або іншую цікавасць [2].

Вылучэнне прадстаўнікоў у асобную групу ўдзельнікаў уяўляецца нам неабгрунтаваным, бо прадстаўнік мае такое ж працэсуальнае становішча, як і ў асобы, якая ўдзельнічае ў справе, якая мае дзяржаўную, грамадскую або іншую цікавасць (з улікам тэрміналогіі ў праекце КГС).

На нашу думку, мэтазгодней было б аднесці прадстаўнікоў да асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, пакінуўшы дзве групы ўдзельнікаў судаводства.

3. Глава 28 праекта КГС уводзіць новы інстытут, які закліканы спрасціць разгляд групавых спрэчак, – вядзенне па калектыўнай іскавай заяве.

Падставамі падачы калектыўнага іску з'яўляюцца агульны для кожнага члена групы адказчык; агульныя або аднастайныя правы і законныя інтарэсы членаў групы ў якасці прадмета спрэчкі; падобныя фактычныя абставіны, на якіх заснаваны правы і законныя інтарэсы членаў групы, абавязкі адказчыка; аднолькавы спосаб судовай абароны. Умова разгляду справы па калектыўным іску – не менш за дзесяць асоб, якія падпісалі заяву і далучыліся да яе.

Калектыўная іскавая заява як інстытут больш вядомы англа-амерыканскаму працэсу, у краінах рамана-германскай прававой сістэмы ён выкарыстоўваецца радзей. Аднак мы перакананы, што ў Рэспубліцы Беларусь калектыўны іск будзе мець прымяненне ў карпаратыўных спрэчках з удзелам ААТ, якія маюць шырокае кола акцыянераў, у сферы нядобрасумленнай канкурэнцыі, пры парушэннях экалагічнага заканадаўства.

4. З улікам развіцця інфармацыйных тэхналогій, нормы праекта КГС прапануюць прававую рэгламентацыю новых інструментаў электроннага правасуддзя.

Артыкул 238 праекта КГС дазволіць ліквідаваць супярэчнасці паміж ГПК і Гаспадарчым працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь, замацаваўшы магчымасць падачы іскавай заявы ў суд у пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента, а таксама ўсталюе патрабаванне, прад'яўленае да формы электроннага дакумента – ён падпісваецца электронным лічбавым подпісам істца або яго прадстаўніка [1].

У главе 4 праект прапануе дапоўніць сродкі даказвання электроннымі доказамі, вызначыўшы паняцце электроннага доказу, парадак яго прадстаўлення і запатрабавання, парадак яго захоўвання і вяртання.

Навацыі закранулі і парадак паведамлення асоб, якія ўдзельнічаюць у справе. Артыкул 110 праекта КГС дазволіць суду паведамляць дзяржаўныя органы і юрыдычныя асобы аб часе і месцы судовага пасяджэння (папярэдняга судовага пасяджэння) праз размяшчэнне адпаведнай інфармацыі на Інтэрнэт-партале судоў агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь.

На нашу думку, вышэйпералічаныя палажэнні з'яўляюцца прагрэсіўнымі і садзейнічаюць працэсу інфарматызацыі. Асабліва актуальныя дадзеныя змены на сённяшні дзень, калі электронныя тэхналогіі з'яўляюцца неад'емнай часткай грамадзянскага абароту і гаспадарчай дзейнасці.

5. Артыкул 519 праекта КГС, які рэгулюе розгляд па справах з удзелам замежных дзяржаў, аддае перавагу інстытуту функцыянальнага судовага імунітэту замежнай дзяржавы, прадугледжанаму ГПК, замест абсалютнага судовага імунітэту, прадугледжанага Гаспадарчым працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Важна адзначыць, што нормы працэсуальнага права павінны вызначаць працэсуальны парадак рэалізацыі і выканання ўжо ўстаноўленых нормаў матэрыяльнага права. З гэтага сцвярджэння вынікае, што першапачаткова заканадаўствам Рэспублікі Беларусь павінны быць прыняты нормы матэрыяльнага права, якія рэгулююць асаблівасці функцыянальнага судовага імунітэту замежнай дзяржавы, а нормы працэсуальнага права ў далейшым вызначыць парадак іх выканання і рэалізацыі. Аднак у Беларусі адсутнічае закон аб імунітэце замежнай дзяржавы, а таксама Рэспубліка Беларусь не з'яўляецца ўдзельнікам міжнародных канвенцый аб імунітэце дзяржаў.

У сувязі з гэтым лічым, што перш чым замацоўваць адпаведныя працэсуальныя нормы, заканадаўства Рэспублікі Беларусь павінна быць, у першую чаргу, дапрацавана нормамі матэрыяльнага права ў сферы функцыянальнага судовага імунітэту замежнай дзяржавы.

6. Праект КГС прапануе новы падыход пры абскарджанні судовых пастаноў – абскарджанне, праверка і перагляд судовых пастаноў у апеляцыйным, касацыйным і наглядным парадку, а таксама ў парадку перагляду па абставінах, якія зноў адкрыліся.

Цяпер сістэма перагляду судовых пастаноў па грамадзянскіх справах прадстаўляе трохінстанцыйную сістэму: апеляцыйнае вядзенне, нагляднае вядзенне і перагляд судовых пастаноў па справах, якія зноў адкрыліся. У той час як сістэма перагляду судовых пастаноў па эканамічных справах уключае і касацыйнае вядзенне.

Такім чынам, праект КГС уводзіць тры інстанцыі для праверкі судовых пастаноў, якія ўступілі ў законную сілу, як па эканамічных, так і па грамадзянскіх справах. Такая сістэма перагляду судовых пастаноў атрымала неадназначнае меркаванне з боку грамадскасці.

А. Алашчанка, суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, прапануе сістэму судовых інстанцый пабудаваць такім чынам, каб можна было ўстанавіць дастаткова шырокае кола падстаў для перагляду судовых пастаноў у апеляцыйным парадку (па пытаннях як права, так і факта); скарочаны пералік падстаў – для перагляду ў касацыйнай інстанцыі (толькі па пытаннях правільнасці прымянення нормаў матэрыяльнага і працэсуальнага права); выключныя падставы – для судовага нагляду (з тым, каб ён быў абумоўлены толькі грубымі парушэннямі аднастайнасці судовай практыкі, канстытуцыйных

праваў і свабод грамадзян, праваў нявызначанага кола асоб і іншых публічных інтарэсаў) [5, с. 12].

Хаця, у прынцыпе можна пагадзіцца з высновамі А. Алашчанкі, і ўсё ж з'яўленне дадатковай праверачнай інстанцыі ў сістэме стадый грамадзянскага судаводства складана прызнаць лагічна абгрунтаваным, зыходзячы з аналізу палажэнняў праекта КГС.

Аналіз палажэнняў праекта КГС дазваляе зрабіць выснову аб тоеснасці касацыйнай і наглядной інстанцыі: суб'екты звароту ў суд у касацыйнай і наглядной інстанцыі, а таксама аб'ект і межы праверкі, паўнамоцтвы ўказаных судовых інстанцый, з'яўляюцца практычна аднолькавымі.

Як у касацыйным, так і ў наглядным вядзенні са скаргай на судовую пастанову, якая ўступіла ў законную сілу, могуць звярнуцца асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, а таксама іншыя асобы, чые правы і законныя інтарэсы парушаны вынесенай судовай пастановай. Праверка ў судзе касацыйнай і наглядной інстанцыі павінна ажыццяўляцца ў межах довадаў скаргі (пратэсту).

У нашым разуменні падвойная праверка судовых пастаноў па грамадзянскіх справах, якія ўступілі ў законную сілу, у тым выглядзе, у якім яна прадстаўлена праектам КГС, з'яўляецца неапраўданай і немэтазгоднай, бо не назіраецца прынцыповых адрозненняў паміж касацыйнай і наглядной інстанцыямі. Прапануем пакінуць сістэму абскарджання судовых пастаноў па грамадзянскіх справах, якая існуе на сённяшні дзень у грамадзянскім працэсуальным заканадаўстве, якая будзе садзейнічаць своечасоваму разгляду скаргаў на судовыя пастановы і не прывядзе да праблемы множнасці інстанцый.

Такім чынам, праект КГС з'явіўся вынікам аб'ектыўнай неабходнасці уніфікацыі дзвюх падобных галін права, некаторыя яго нормы ўзніклі пад уплывам інфармацыйных тэхналогій і з'яўляюцца прагрэсіўнымі на сённяшні дзень, аднак ёсць і тыя нормы, якія патрабуюць далейшага ўдасканалення і навуковага асэнсавання, што дазволіць зрабіць структуру цывілістычнага працэсу найбольш эфектыўнай і аператыўнай.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Праект Кодэкса грамадзянскага судаводства Рэспублікі Беларусь. Грамадскае абмеркаванне [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: https://forumpravo.by/publichnoe-obsuzhdenie-proektovnpa/forum15/16857-proekt-kodeksa-grazhdanskogo-sudoproizvodstva-respubliki-belarus?PAGEN_2=1. – Дата доступу: 15.11.2022.

2. Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]: Кодэкс Рэспублікі Беларусь, 11 студзеня 1999 г., № 238-З: Прыняты Палатай прадстаўнікоў 10 снежня 1998 г.: Адобраны Саветам Рэспублікі 18 снежня 1998 г.: у рэдакцыі з улікам змяненняў, унесеных Законам Рэспублікі Беларусь ад 27 мая 2021 г. №113-З // ЭТАЛОН. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь / Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 2023.

3. Гаспадарчы працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь [Электронны

рэсурс]: Кодэкс Рэспублікі Беларусь, 15 снежня 1998 г., № 219-З: Прыняты Палатай прадстаўнікоў 11 лістапада 1998 г.: Адобраны Саветам Рэспублікі 26 лістапада 1998 г.: у рэдакцыі з улікам, унесеных Законам Рэспублікі Беларусь ад 27 мая 2021 г. №113–З // ЭТАЛОН. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь / Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 2023.

4. Сысуеў, Т. В. Праект Кодэкса грамадзянскага судаводства вачыма практыка: асноўныя змены, перавагі і недахопы [Электронны рэсурс] / Т. В. Сысуеў // Сайт ilex. Навіны. – Рэжым доступу: https://ilex.by/news/proekt-kodeksa-grazhdanskogo-sudoproizvodstva-glazami-praktika osnovnyeizmeneniya-preimushhestva-i-nedostatki/. – Дата доступу: 18.11.2022.

5. Алашчанка, А. Касацыйны парадак праверкі судовых пастаноў у цывілістычным працэсе, якія ўступілі ў законную сілу / А. Алашчанка // Судовы веснік. – 2021. – № 1. – С. 10–15.